

**МАКЕЙ Іван Юр'евіч**
**(1882, в. Дзярэчын, Зэльвенскі раён, Гродзенская вобласць — 7 ліпеня 1955) — беларускі народны казачнік**

Семдзесят тры гады пражыў на радзіме, у вёсцы Алексічы, беларускі народны казачнік Іван Юр’евіч Макей.

Нарадзіўся Іван Макей у 1882 годзе ў вёсцы Дзярэчын. Пэўны час, каб не памерці з голаду, парабкаваў.

Пасля працаваў у Беластоку на тэкстыльных фабрыках, у пякарні. У 1904 годзе разам з ям’ёй пераехаў у Алексічы.

Аднавяскоўцы з павагай і любоўю называлі Івана Юр’евіча «артыстам». На ўсё наваколле гэта быў адзіны казачнік, які не толькі расказваў, але і сам складаў казкі.

У куце свае хаты, заўсёды перапоўненай цікаўнымі слухачамі, ён «разыгрываў» казку ў асобах, па-майстэрску перадаваў інтанацыі, міміку, рухі, нават паходку казачных персанажаў.

Апавядальныя эпізоды ён звычайна перадаваў, седзячы на табурэтцы, роўным голасам. Калі ж пачынаўся дыялог, казачнік уставаў і як бы пераўвасабляўся ў дзейных асоб. Кампазіцыйныя і стылістычныя асаблівасці, што адрозніваюць традыцыйную казку ад бытавой, у казках Макея амаль не адчуваліся. Ён нібыта спраўляў разнастайныя чарадзейныя і бытавыя, камічныя і драматычныя сюжэты.

У 1946 годзе ў час фальклорнай практыкі студэнты Белдзяржуніверсітэта запісалі ад Івана Макея трыццаць казак. Адна з лепшых чарадзейных казак яго рэпертуару «Кіёчак» была апублікавана ў 1973 годзе ў зборніку «Чарадзейныя казкі». Друкаваліся яго казкі і ў другіх выданнях.

Казкі Івана Макея лёгка пазнаць. Стылістычнай абраднасці і традыцыйнага трохчастковага кампазіцыйнага дзеяння ў яго назвах няма. Так, у яго варыянце казкі «Звярынае малако» замест трохразовага або шматразовага падарожжа па звярынае малако герой робіць адно, здабываючы малако ад розных звяроў.

Замест традыцыйных шчаслівых развязак у яго даволі часта сустракаюцца драматычныя. Напрыклад, казка «Кіёчак» мае менавіта такі фінал.

У 1980 годзе ў Берліне на нямецкай мове выйшла з друку кніга «Беларускія народныя казкі». Сярод іншых у кнігу трапіла і казка нашага земляка «Кіёчак».

Памёр народны казачнік у 1955 годзе, а нашчадкам сваім ён пакінуў чароўны і непаўторны свет казак.

## Бібліяграфія


1. **Жабрак, П. Жывая спадчына** / П. Жабрак // Праца. — 1992. — 18 лютага. — С. 4.
2. **Зэльвенскія карані** // Чыгрын, С. Краязнаўчымі сцежкамі Зэльвеншчыны: артыкулы, гутаркі / Сяргей Чыгрын. — Мінск: Кнігазбор, 2013. — С. 29—33.
3. **Макей Іван Юр'евіч** // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 9: Кулібін — Малаіта / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш.. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 536.
4. **Макей Іван Юр'евіч //** "Знакамітыя людзі Зэльвеншчыны – юбіляры 2022 года"**:** інфармацыйна-краязнаўчы буклет. Выпуск 6 / склад. С. В. Гецман. — Зэльва: ДУК "Зэльвенская раённая бібліятэка", 2022. — С. 3—4. — (Серыя: "Краязнаўчы каляндар").
5. **Макей Іван Юр'евіч** // Памяць. Зэльвенскі раён: Гісторыкадакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал.: У. С. Богаў, Т. П. Броска, І. І. Васілеўка і інш. ; Уклад. Т. П. Броска ; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мінск : Паліграфафармленне, 2003. — С. 421.
6. **Макей Іван Юр'евіч** // Республика Беларусь: Энциклопедия: В 6 т. Т. 4 / Редкол.: Г. П. Пашков и др. — Минск: БелЭн, 2007. — С. 619.
7. **Макей Іван Юр'евіч //** Эныклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Т. 3 Карчма - Найгрыш / Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал.рэд) і інш. — Мінск: БелСЭ, 1986. — С. 403.
8. **Народны казачнік Макей з Дзярэчына** / склад. В. Л. Масюк. — Зэльва: ДУК "Зэльвенская раённая бібліятэка", 2016. — 11 с.